ЛІТАРАТУРА

1. Дзядко Дз. В. Да пытання пра ўласналексічны спосаб тэрмінаўтварэння (на матэрыяле беларускай матэматычнай тэрміналогіі) / Дз. В. Дзядко // Язык и межкультурные коммуникации: сборник научных статей. – Мн. : БГПУ, 2007. – С. 105.
2. Гринев-Гриневич, С. В. Терминоведение / С. В. Гринев-Гриневич. – Москва : Изд. центр «Академия», 2008. – 304 с.
3. Казкенова, А. К. Онтология заимствованного слова : монография / А.К. Казкенова. – М. : ФЛИНТА : Наука, 2013. – 248 с.
4. Касько, У. К. Слоўнік выдавецкіх тэрмінаў / У. К. Касько. – Мінск : БДУ, 2012. – 130 с.
5. Слоўнік выдавецкіх і паліграфічных тэрмінаў: анг.-бел., бел.-анг. / Уклад. К. Санько. – Мн.: Тэхналогія, 2003. – 93 с.
6. Уласевіч, В. І. Слоўнік новых запазычаных слоў беларускай мовы / В.І. Уласевіч, Н. М. Даўгулевіч. – Мінск : Беларусь, 2023. – 175 с.

УДК 821.161.3-26

В.А. Мандзік, ст. навук. супр., канд. філал. навук
(ЦДБКМіЛ НАН Беларусі, г. Мінск)

# КАНСАНАНТНАЯ ДЫСТРЫБУЦЫЯ МЯККАГА ФРЫКАТЫЎНАГА [γ'] У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЕ

Сярод актуальных тэарэтычных і прыкладных праблем сучаснага беларускага мовазнаўства асаблівае месца належыць даследаванню фанетычнай сістэмы ў цеснай узаемазвязанасці з працэсам маўлення і размеркавання фанем у маўленні. Устанаўленне як мага больш падрабязнага рэестра дыстрыбуцыйных кантэкстаў, характэрных для кожнага асобнага гука, – аснова для складання фаналагічнага корпуса беларускай мовы, разнастайных прыкладных праграм навучання беларускай мове, удасканалення сістэм аналізу і сінтэзу беларускага маўлення.

Менавіта ў рэчышчы гэтых запатрабаваных задач знаходзіцца праца па стварэнні корпуса беларускай кансанантнай дыстрыбуцыі, якая прадугледжвае выяўленне спалучальных уласцівасцей і абмежаванняў асобных груп зычных, а таксама складанне базы магчымых кансанантных сегментаў.

У адносінах да фанетычнай сістэмы кансанантная дыстрыбуцыя вызначае спецыфіку размеркавання зычных гукаў адносна адзін аднаго, дазволенае законамі пэўнай мовы. Прынцыпы вывучэння кансанантнай дыстрыбуцыі заключаюцца ў тым, што за адзінку даследавання бярэцца фанетычнае слова, улічваюцца тры пазіцыі ўнутры

яго (пачатковая, сярэдзінная, канцавая), бяруцца пад увагу неспецыфічныя спалучэнні зычных, якія ўзнікаюць у выніку адаптацыі новых лексем [1].

Наяўнасць у беларускай фанетычнай сістэме заднеязычнага фрыкатыўнага [γ] з'яўляецца адной з яе спецыфічных асаблівасцей у параўнанні з рускай фанетычнай сістэмай. Я.Ф. Карскі лічыў, што ўжо ў X ст. у продкаў беларусаў [г] быў не выбухным, а фрыкатыўным [2, с. 369]. Пазней акустычныя і артыкуляцыйныя характарыстыкі гэтага зычнага былі ўстаноўлены з дапамогай інструментальных метадаў [3, с. 44–45, 82–83]. Па назіраннях Л.Ц. Выгоннай [4, с. 204], у двухчленных кансанантных спалучэннях шчылінны [γ] шырока адзначаецца і ў беларускай, і ў запазычанай лексіцы: *[γл']іна*, *ку[рγ]ан*, *рэ[γб']і*, *сё[мγ]а*. Прычым ён можа выступаць і першым, і другім членам такіх сегментаў. Трохчленныя кансанантныя групы з [γ] часцей сустракаюцца на стыку прыстаўкі і кораня, пры гэтым ён, як правіла, займае сярэднюю пазіцыю ў спалучэнні: *а[бγл]аджваць*, *а[бγр]ызаць*, *а[дγн']ісці*, *[зγл']едзець*, *[зγр]увасціць*, *ня[ўзγ]однены*, *па[дγр]узіць*, *па[ўγл']ядацца*. Унутры кораня і ў іншых пазіцыях у трохчленных кансанантных спалучэннях дадзены зычны больш рэдкі: *абве[рγн]уць*, *вя[нγл']ярня*, *[зγр]ая*, *ка[нγл]амерат*, *ка[нγр]эс*.

Прыведзеныя вышэй назіранні тычацца цвёрдага зычнага, пра яго мяккі карэлят звесткі не падаюцца. Аналіз корпуса «Арфаэпічнага слоўніка беларускай мовы» [5] паказаў, што ў беларускай кансанантнай сістэме магчымасці спалучэння мяккага фрыкатыўнага [γ'] з іншымі зычнымі значна больш абмежаваныя, чым у цвёрдага [γ]. Па-першае, мяккі [γ'] не можа выступаць у якасці першага члена ні двухгукавых, ні трохгукавых груп зычных незалежна ад іх становішча ў слове. Такім чынам, у беларускім маўленні могуць функцыянаваць толькі спалучэнні структуры «зычны + [γ']». Па-другое, назіраецца карэляцыя пазіцыйнага функцыянавання такіх кансанантных груп з паходжаннем лексікі: калі яны з'яўляюцца ў каранёвых марфемах, то ў пераважнай большасці выпадкаў гэта будуць запазычаныя словы.

Пазіцыйныя абмежаванні функцыянавання сегментаў «зычны + [γ']» заключаюцца ў тым, што яны не выступаюць у абсалютным **канцы** слоў, а ў **пачатку** слоў сустракаецца толькі спалучэнне [зγ'] (*згібаць* [**зγ'**ібáц'], *згідзіць* [**зγ'**íз'іц'], *згінуць* [**зγ'**íнуц']).

Уласна фанетычныя абмежаванні кансанантнай дыстрыбуцыі мяккага [γ'] звязаны з якасцю папярэдніх зычных. Так, першым членам спалучэнняў «зычны + [γ']» не могуць быць глухія гукі – толькі санорныя і звонкія. Не выступаюць тут звонкія афрыкаты, адзінкавы выпадак зафіксаваны ў трохгукавым сегменце [рzγ']: *э**рцг**ерцаг* [э**рzγ'**эрцах]. Таксама не спалучаецца [γ'] з папярэднімі мяккімі, за выключэннем [л'].

Такім чынам, у **сярэдзіне** слоў ужываюцца сегменты:

«выбухны + [γ’]» ([бγ’], [дγ’]) – выключна на стыку прыстаўкі і кораня: *паабгінаць* [паа**бγ’**іна́ц’], *падгібны* [па**дγ’**ібны́], *перадгісторыя* [п’эра**дγ’**істо́рыйа];

«фрыкатыўны + [γ’]» ([зγ’]) – у каранёвых марфемах славянскага і іншамоўнага паходжання (*дыфасген* [дыфа**зγ’**э́н], *рэзгіны* [рэ́**зγ’**іны], *лезгінка* [л’э**зγ’**і́нка], *бязмозгі* [б’азмо́**зγ’**і]), а таксама на стыку прыстаўкі і кораня (*разгерметызацыя* [ра**зγ’**эрм’этыза́цыйа], *разгіб* [ра**зγ’**і́п]);

«санорны + [γ’]» – самая шматлікая група. У каранёвых марфемах яна прадстаўлена сегментамі [лγ’] (*алгебра* [а́**лγ’**эбра], *неўралгія* [н’эўра**лγ’**і́йа]), [л’γ’] (*анальгін* [ана**л’γ’**і́н], *бельгіец* [б’э**л’γ’**і́йэц]), [нγ’] (*ангіна* [а**нγ’**і́на], *баўлінгіст* [баўл’і**нγ’**і́ст], *лангетка* [ла**нγ’**э́тка]), [рγ’] (*алергічны* [ал’э**рγ’**і́чны], *бургер* [бу́**рγ’**эр], *вяргіня* [в’а**рγ’**і́н’а], *палтэргейст* [палтэ**рγ’**э́йст]), [йγ’] (*зейгер* [з’э́**йγ’**эр], *штэйгер* [штэ́**йγ’**эр]), [ўγ’] (*доўгі* [до́**ўγ’**і], *еўгеніст* [йэ**ўγ’**эн’і́ст]).

На **сандхіяльных** стыках функцыянуюць ужо названыя групы з папярэднімі санорнымі [лγ’] (*хлаpалгідрат* [хлара̀**лγ’**ідра́т]), [нγ’] (*тэрпінгідрат* [тэрп’і̀**нγ’**ідра́т]), [рγ’] (*супергігант* [су̀п’э**рγ’**іγа́нт]), а таксама спалучэнне з фрыкатыўным [ж], які ўзнік у выніку азванчэння парнага глухога [ш] (*звышгенератар* [звы̀**жγ’**эн’эра́тар]).

Дыстрыбуцыйныя магчымасці і абмежаванні функцыянавання [γ’] пры спалучэнні з папярэднімі зычнымі прадстаўлены ў табліцы.

**Табліца – Кансанантная дыстрыбуцыя мяккага фрыкатыўнага [γ’]**

| пазіцыя ў слове / спалучэнне зычных | пачатак | сярэдзіна | канец | сандхі |
|---|---|---|---|---|
| [зγ’] | + | + | – | – |
| [жγ’] | – | – | – | + |
| [бγ’] | – | + | – | – |
| [дγ’] | – | + | – | – |
| [лγ’] | – | + | – | + |
| [л’γ’] | – | + | – | – |
| [нγ’] | – | + | – | + |
| [рγ’] | – | + | – | + |
| [йγ’] | – | + | – | – |
| [ўγ’] | – | + | – | – |

Немагчымасць выступаць першым членам двухкампанентных кансанантных спалучэнняў – спецыфічная рыса не толькі звонкага фрыкатыўнага [γ’], але і зычных [в], [в’] (за рэдкім выключэннем), якія адносяцца да гэтай жа групы. У той жа час звонкія фрыкатыўныя [з], [з’], [ж] такіх абмежаванняў у кансанантнай дыстрыбуцыі не маюць.

ЛІТАРАТУРА

1. Мандзік, В. А. Прынцыпы даследавання кансанантнай дыст-

рыбуцыі ў беларускай літаратурнай мове / В. А. Мандзік // Труды БГТУ. Сер. 4, Принт- и медиатехнологии. – 2024. – № 2 (285). – С. 140–144.
2. Карский, Е. Ф. Белорусы : в 3 т. / Е. Ф. Карский ; ред. совет: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. Энцыкл., 2006–2007. – Т. 2 : Язык белорусского народа, кн. 1. – 2006. – 453 с.
3. Крывіцкі, А. А. Фанетыка беларускай мовы : вучэб. дапам. / А. А. Крывіцкі, А. І. Падлужны. – Мінск : Выш. шк., 1984. – 269 с.
4. Выгонная, Л. Ц. Інтанацыя. Націск. Арфаэпія / Л. Ц. Выгонная; рэд. А.І. Падлужны. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 215 с.
5. Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы / Нац. акад. навук Беларусі [і інш.] ; уклад.: В. П. Русак [і інш.] ; рэдкал.: В. П. Русак, Ю. С. Гецэвіч, С. І. Лысы. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 757 с.

УДК 81’373.21 (476.7)

В.М. Босак, праф., д-р с.-г. навук;
А.А. Босак, дац., канд. філ. навук (БДЭУ, г. Мінск)

# ТАПОНІМ “КРЫВЯНАЯ КАЎБАСА” Ў ГАВОРКАХ ВЕРХНЯГА НАД’ЯСЕЛЬДЗЯ

На тэрыторыі Верхняга Над’ясельдзя (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і сумежжа) вылучана сем адмысловых гаворак, якія маюць адметныя фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя асаблівасці [1–20].

Даследаванне па вызначэнню лексічных асаблівасцей гаворак Верхняга Над’ясельдзя (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і сумежжа) праводзілася ў форме апытвання па спецыяльна распрацаванай праграме, якая ўключала 102 пытанні па лексіцы, у тым ліку па тэматычный групе “ежа” [3].

У тэматычнай групе ‘ежа’ значную цікавасць выклікае тапонім ‘крывяная каўбаса’ [3–6]. Для абазначэння ‘крывянай каўбасы’ ўжываюцца лексічныя і словаўтваральныя варыянты: *кішка*, *шклёндра*, *шкіле́нда*, *крупэ'ня*, *наліванка* /*налівачка*, *налівайка*/, *каша́нка*, *крывя'нка*, *чо́рная каўбаса́* (малюнак). Найбольш пашыраным з’яўляецца слова *кішка*. Яно выкарыстоўваецца ў гаворках цэнтральнай, паўднёва-ўсходняй, паўночнай частак даследуемага рэгіёна.

Назва *шклёндра* бытуе ў гаворках захаду рэгіёна, а таксама спарадычна ўжываецца паралельна з найменнем *кішка* ў гаворках цэнтральнай часткі Верхняга Над’ясельдзя.